ЧАС НАСЕННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Выбар насення — адзін з самых адказных этапаў падрыхтоўкі да агароднага сезона, які шмат у чым вызначае канчатковы вынік. Гэта вядома кожнаму агароднику. Бо якасць насення тут — мабыць, ключавы фактар.

— Вопыт паказвае, што лепш выбіраць насенне сартоў і гібрыдаў, унесеных у Дзяржаўны рэестр культур, рэкамендаваных да выкарыстання ў Беларусі. А каб ураджай быў крыху раней, вядома, дзве траціны маіх пакупак — ранняспелыя сарты і гібрыды, — дзеліцца Кіра Іосіфаўна, пенсіянерка-дачніца.

Да сярэдзіны сакавіка ў дасведчаных агароднікаў, як правіла, усё ўжо распланавана: складзены план пасадак і спіс культур, сартоў і гібрыдаў, а вельмі часта — нават спіс кампаній-вытворцаў пасяўнога матэрыялу, якія выклікаюць давер. Гэта дачнікі-пачаткоўцы не здольны ўпэўнена плаваць у моры яркіх пакуначкаў з выявамі, што абяцаюць небывалыя ўраджаі. У кожнага агародніка са стажам у пытанні выбару фірмы па вытворчасці насення існуюць уласныя перавагі. Ёсць кампаніі, якія толькі фасуюць і рэалізуюць насенне, расказвае пенсіянерка, але лепш выбіраць пасяўны матэрыял непасрэдна ад вытворцы. Таму многія агароднікі вясной адпраўляюцца не ў крамы і не на рынкі, а ў Інстытут плодаагародніцтва — там таксама цяпер ідзе рэалізацыя насення. Збіраецца туды і мая суразмоўніца, але пакуль што вырашыла наведаць краму: «Тут таксама шмат цікавага».

— А наогул, агародам я займаюся ў першую чаргу для задавальнення і для здароўя, — кажа яна. — Але і ўраджаю, вядома, хочацца. Сёння, улічваючы цэны на насенне і грунт для расады, сродкі абароны раслін і іншае, што трэба дачніку, выгада ад уласнага ўраджаю не такая і вялікая. Я не падлічвала, але мне здаецца, працсей гародніну ўвосень проста купіць: па выдатках атрымаецца тое ж самае, калі не танней. Асабліва калі ўлічыць яшчэ і ўкладзеную працу. Так што сад-агарод у нашы дні — гэта, напэўна, проста захапленне, хобі.

І ўсё ж, мяркуючы па попыце на насенне, захапленне гэта не губляе папулярнасці. Дык у якую суму абыдзецца дачніку пасяўная?

ШТО ПАЧЫМ ДЛЯ АГАРОДНІКА

Пачнём з цыбулі-сеянкі, якая, напэўна, ёсць у кожным без выключэння спісе пакупак агародніка. Цана на яе летась дасягала 14,90 за кіло (гэта быў самы дарагі варыянт, можна было знайсці значна таннейшы, у сярэднім рублёў за восем). У гэтым годзе цыбуля-сеянка (вытворчасць Нідэрландаў), напрыклад, у «Мацерыку» каштуе 14,68–14,92 за кілаграм. Але, як і летась, можна знайсці танней.

Пакупнікі кажуць, што ў гэтым годзе (як і ў мінулым) у анлайн-крамах цэны ад афлайну практычна не адрозніваюцца. Летась, расказваюць яны, цана пакуначка насення пачыналася ад 60–68–99 капеек (айчынная і расійская вытворчасць) і даходзіла да 5–7 рублёў (Польшча, Італія, Галандыя). У сярэднім адзін пакуначак абыходзіўся ў 1–2 рублі. Сёння ўсё чакана даражэй, хоць быццам бы таксама не надта і дорага: цана насення айчыннай і расійскай селекцыі — у дыяпазоне ад 1,3 да 2,5 рубля за пакуначак. Але, кажа пакупніца дачнай секцыі «Мацерыка» Раіса, у кожнай упакоўцы не вельмі і шмат саміх семечак — штучак дзесяць. Так што на парнік такіх пакуначкаў трэба некалькі. А хочацца ж паспрабаваць вырасціць яшчэ і розныя сарты. Таму і патрэбна планаванне. «Бачыце — усе з блакнотамі?» Купляць лішняе занадта марнатраўна, тлумачыць яна.

Прадаўцы адзначаюць, што ў топе продажаў — беларускае і расійскае насенне. І не толькі з-за цаны.

— Сарты і гібрыды айчыннай селекцыі паказваюць свой максімум менавіта ў нашай кліматычнай зоне, — кажа **прадавец-кансультант агароднай секцыі аднаго са сталічных гіпермаркетаў Аксана КЛІМКОВІЧ**. — Калі казаць аб замежнай селекцыі, важна выбіраць раяніраваныя сарты і гібрыды: яны адаптаваны да беларускіх умоў і ўстойлівыя менавіта да нашых знешніх фактараў. Дасведчаныя дачнікі гэта ведаюць. На дзівосы ласыя ў асноўным дачнікі-пачаткоўцы. Ім мы заўсёды раім праверыць сорт праз дзяржаўны рэестр — інтэрнэт жа сёння ва ўсіх у тэлефоне. А калі ўжо вельмі хочацца паспрабаваць што-небудзь незвычайнае — вазьміце адзін пакуначак у якасці эксперымента.

Беларуская селекцыя ў крамах — у дастаткова шырокім асартыменце. Цэны на пасяўны матэрыял зеляніны стартуюць ад 1,4 рубля, памідоры, перац і агуркі розных сартоў і гібрыдаў — у сярэднім 1,78–2,5. Насенне морквы і радыскі абыдзецца дачніку да рубля (прыкладна 90 капеек). Па традыцыі шырока прадстаўлена і расійская селекцыя: «Сібірскі сад», «Рускі агарод», праверанае часам «Аэліта»...

У насенні еўрапейскай селекцыі на паліцах крам недахопу таксама няма: у асартыменце і польскае, і галандскае, і вытворчасці Германіі і Італіі. Цэны супастаўныя з айчынным і расійскім насеннем (кабачок нямецкай селекцыі — 1,55, буракі — рубель, таматы — 1,40). Асобна стаіць італьянскае насенне — яно адчувальна даражэйшае (таматы — 3,35–5,5 і нават 8,05, перац — 3–6,5 рубля). Што датычыцца відаў культурных раслін, пасяўны матэрыял якіх даступны сучаснаму агароднику, — гэта, без перабольшання, практычна ўсё, што дакладна ці хаця б тэарэтычна можна вырасціць у беларускім клімаце. Ад памідораў-агуркоў (дзясяткі, а мабыць, і сотні сартоў і гібрыдаў) да капусты ўсіх відаў (у тым ліку брусельскай, брокалі і нават дэкаратыўнай), салодкага і вострага перцу, морквы, цыбулі, самай рознай зеляніны (а таксама мікразеляніны) і ягад (у першую чаргу гэта, вядома, клубніцы і суніцы — у сярэднім ад 1,5 да 2,5 за пакунак). Ёсць нават такія вынаходствы, як гібрыд F1 кавуна «Разарыё» (1,78 за пакет насення) або міцэлій чырвонагаловікаў, лісічак, апенек (вытворчасць Расіі). Аматарскае грыбаводства — нятаннае задавальненне: 10,99 за пакуначак міцэлію.

— Многія цікавяцца, ды не ўсе купляюць, — тлумачыць **прадавец крамы «Насенне» Наталля АГЕЕВА**. — Я б раіла пачынаць, напрыклад, з шампіньёнаў — для штучнага культывавання ў першую чаргу падыходзяць грыбы, якія адносяцца да сапратрофаў (шампіньёны) або ксілатрофаў (вешанка). Але ў некаторых дачнікаў атрымліваецца «прыручыць» нават такія, здавалася б, лясныя грыбы, як чырвонагаловікі або лісічкі. Гэта сапраўды выклікае павагу і захапленне. Бо атрымаць ураджай такіх грыбоў — справа няпростая. Для іх росту неабходна дрэва, прычым далёка не ўсякае, таму што растуць яны ў складаным сімбіёзе з каранямі вызначаных дрэў. Бачыце, на пакеціках з міцэліем падрабязная інструкцыя — з ёй абавязкова трэба азнаёміцца і перад набыццём пасадачнага матэрыялу ацаніць свае магчымасці: ці ёсць на вашым участку або паблізу патрэбнае дрэва і ці зможаце вы стварыць неабходныя для ўраджаю ўмовы.

РАСЛІНЫ БЕЗ ХВАРОБ, ЗАВЯЗІ БЕЗ АПЫЛЕННЯ

Але вернемся да больш звыклых агародных культур. У першую чаргу попытам сёння карыстаецца насенне агуркоў, памідораў і салодкага перцу: сартоў і гібрыдаў гэтых культур спецыялізаваныя аддзелы традыцыйна прапануюць больш за ўсё. Калі яшчэ гадоў пяць таму да гібрыдаў агароднікі толькі прыглядаліся, то сёння пакуначкі з пазнакай F1 (менавіта гібрыды) у іх у прыярытэце. Такое насенне нярэдка даражэйшае за сарты, і ўласнага насення з іх увосень не атрымаеш. Але ад самастойнай вытворчасці насення большасць агароднікаў сёння адмовілася.

— Купіць якаснае, з высокай усходжасцю і гарантаванай ураджайнасцю насенне сёння не складае праблемы. Рынак насычаны насенным матэрыялам як айчыннай, так і замежнай селекцыі, — каментуе **кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Анатоль ХЛЕБАРОДАЎ**. — Між тым ураджайнасць у сартоў заўсёды ніжэйшая, чым у гібрыдаў.



Попытам у пакупнікоў карыстаюцца гібрыды, якія не патрабуюць апылення, адзначаюць прадаўцы. Гібрыды першага пакалення — тыя, дзе на пакунку ёсць пазнака F1, — найболей устойлівыя да самых распаўсюджаных у нашай кліматычнай зоне захворванняў раслін. У новыя сарты таксама закладзены імунітэт да хвароб, але гібрыды ў гэтых адносінах лепшыя, лічыць яшчэ адна пакупніца, дачніца з 30-гадовым стажам.

— Насенне цяпер прадаюць круглы год, але я супраць таго, каб купляць яго загадзя, — дзеліцца яна. — Асабліва калі вы не ўпэўнены, што будзеце захоўваць яго правільна. Агароднінныя культуры лепш набываць з канца лютага да пачатку лета. І кветкі-аднагодкі штогод купляю прыкладна тады ж — са студзеня да мая. А вось шматгадовыя кветкі і цыбульныя можна купіць і ў верасні. Цана на іх ніжэйшая, а пасадачны матэрыял выдатна захоўваецца аж да часу, калі яго трэба высаджваць на расаду. Пад кветкавае насенне адведзены асобныя стэлажы, і, мяркуючы па пакупніцкім попыце, агароднікаў у нас значна больш, чым кветкаводаў. Але дачнікі (пераважна, вядома, дачніцы) заходзяць і ў кветкавыя рады. Насенне для кветнікаў каля дома якраз цяпер высейваюць на расаду. Асартымент самы шырокі: ад звыклых петуній да лабеліі, лаванды, пеларгоніі і яшчэ дзясяткаў і дзясяткаў розных відаў і сартоў. Цана пакуначка насення для клумбы стартуе ад 1 рубля 40 капеек, але можа дасягаць і 5-6 рублёў.

КРЫТЭРЫІ ВЫБАРУ

Выбар правільнага насення — аснова поспеху агароднika, і пра тое, як гэта зрабіць практычна, напісана шмат. Калі абагульніць, найважнейшыя рэкамендацыі гучаць так:

• Загадзя знаёмімся з сартамі і гібрыдамі, тымі патрабаваннямі, якія яны прад'яўляюць да складу глебы, тэмпературы паветра і зямлі, догляду. Аб неабходнасці выбару раяніраваных у Беларусі сартоў мы гаварылі вышэй.

• Звяртаем увагу на ўраджайнасць. Гэта нібыта відавочна, але, як кажуць, не ўсё так адназначна. Не заўсёды высокаўраджайныя сарты сапраўды гарантуюць высокія ўраджаі канкрэтна на вашых градках ці ў цяпліцах. Чым больш ураджайны сорт, тым вышэйшыя яго патрабаванні да якасці глебы і догляду. Магчыма, вы будзеце збівацца з ног, каб дагадзіць «капрызулі», а ў выніку атрымаеце ўраджай, ніжэйшы за сярэдні. Асабліва калі вашым градкам ужо шмат гадоў і глеба на іх не надта пажыўная. Самыя звычайныя, не асабліва прадукцыйныя сарты падораць вам больш радасці, калі прыйдзе час збіраць ураджай. Бо яны менш патрабавальныя.

• А вось устойлівасць да хвароб — найважнейшы крытэрый выбару насення. Як ужо гаварылася, тут вельмі выйграюць гібрыды. Зрэшты, імунітэт навукоўцы-селекцыянеры закладваюць і ў новыя сарты. Таксама важная ўстойлівасць да неспрыяльных вонкавых фактараў і шкоднікаў.

Важны аспект выбару насення — звесткі аб лёжкасці пладоў. Бо вітаміны з уласнага агарода важна не толькі вырасціць, але і захаваць. Ураджай ранніх сартоў, як правіла, не захоўваецца. І гэта трэба ўлічваць: на зімовае захоўванне варта выбіраць сярэдняспелыя і сярэднепазнія сарты. Пад іх важна адвесці месца на градках і запланаваць патраціць сродкі на іх насенне.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.

Добрая навіна

«БЕЛАРУСНАФТА» СЕЛЕТА ПЛАНУЕ ЎВЕСЦІ 40 НОВЫХ «ЗАРАДАК»

Пра гэта заявіў дырэктар унітарнага прадпрыемства «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка» Аляксандр ДРАГУН. Ён адзначыў, што фірмовая сетка «Беларуснафты» прадстаўлена 575 аўтазаправачнымі станцыямі — гэта больш за 65 % ад колькасці ўсіх АЗС. Яны размешчаны прапарцыянальна, на асноўных трасах, у тым ліку міжнародных, прыгранічных пераходах, у абласных, раённых цэнтрах і ў сталіцы. Як сказаў Аляксандр Драгун, асноўныя крытэрыі іх сучасных АЗС — бяспека, якасць і камфорт для наведвальнікаў.

На АЗС кліентам прапаноўваецца шырокі спектр паслуг: крамы, кафэ, стаянкі легкавых і грузавых аўтамабіляў, пасты падпампоўкі шын, пылососы, зарадка электрамабіляў, зарадка гаджэтаў, пляцоўкі для караванінгу, такія паслугі, як страхаванне, аплата праезду па платных дарогах Беларусі.

«Беларуснафта» актыўна ўдзельнічае ў аснашчэнні аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу найноўшым абсталяваннем і актыўна вядзе работы па іх абнаўленні. Але новыя аб'екты, у асноўным, сёння не будуюцца. Ідзе рэканструкцыя аб'ектаў альбо мадэрнізацыя гандлёвых залаў. Па выніках мінулага года было рэканструявана 12 аб'ектаў. У гэтым годзе плануецца рэканструкцыя яшчэ 19. Гэта паўнавартасная замена старога аб'екта на новы. Таксама ў 2023 годзе мадэрнізавана больш за 20 гандлёвых залаў, у бягучым годзе ў планах — мадэрнізацыя яшчэ 10 аб'ектаў.

Акрамя таго, сёлета згаданае ўнітарнае прадпрыемства працягвае развіваць **інфраструктуру для электрамабіляў**. Такім чынам, на працягу гэтага года плануецца ўвесці 40 новых зарадных станцый, аснашчаных канектарам GB / T. Варта нагадаць, што сёння ў краіне функцыянуе 698 зарадных станцый «Беларуснафты»: хуткія зарадныя станцыі ў колькасці 564 адзінкі (Mode 4) і павольныя — 134 адзінкі (Mode 3). Яны размешчаны прапарцыянальна па ўсёй тэрыторыі краіны. З іх 383 знаходзяцца ў Мінску, у Мінскай вобласці — 49, Брэсцкай — 55, Віцебскай — 48, Гомельскай — 64, Гродзенскай — 62 і ў Магілёўскай — 37 зарадных станцый. Гэта дазваляе нашым аўтааматарам бесперашкодна падарожнічаць, перасоўвацца па тэрыторыі нашай краіны. «Таксама ёсць спецыяльны дадатак «Маланка», праз які карыстальнік можа бачыць свабодныя аб'екты», — расказаў Аляксандр Драгун.

Эксперт адзначыў, што раней у Мінску быў уведзены ў эксплуатацыю суперхуткі зарадны комплекс. Ён стаў першым і ўнікальным у краінах СНД. На ім электрамабілі могуць зарадзіцца за 9 хвілін да 300 кіламетраў ходу. Там жа заряджаюцца і электробусы. Сёлета плануецца ўвесці тры суперхуткія комплексы — два на рэспубліканскіх трасах, а адзін у сталіцы нашай краіны.

Паводле слоў спецыяліста, сучасная АЗС — гэта не толькі месца, дзе можна заправіць аўтамабіль палівам. Гэта таксама рэалізацыя спадарожных тавараў, прадукцыі грамадскага харчавання, месца, дзе можна адпачыць у шляху. «У нашай сетцы АЗС больш за 450 крам, сумешчаных з кафетэрыямі. Асартымент тавараў прадстаўлены групай фастфудаў (хотдогі, сэндвічы), блінамі, гарачымі і ахаладжальнымі напоямі, а таксама стравамі беларускай кухні», — адзначыў ён.

Сяргей КУРКАЧ.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» в форме открытого аукциона

№ лота	Наименование предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб. (10 %)	Шаг аукциона, бел. руб. (5 %)
1	Генератор сварочный EP200X-XC-200АД (только двигатель), инв. 434	10,44	1,04	0,52
2	Дрель ударная GSB 19-2 RE (н/раб.), инв. 756	1,20	0,12	0,06
3	Компьютер монитор «Самсунг 795», инв. 436	0,52	0,05	0,03
4	Перфоратор SDS plus Bosch GBH 2-28 DFV Герм (н/раб.), инв. 753	1,20	0,12	0,06
5	Телефакс, инв. 98	0,14	0,01	0,01
6	Имущество согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1TZ6DIdAX3VN93T4FOyH4T1ciBpVu-C0G/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	137,25	13,72	6,86
7	1. Дорожные плиты, 4 шт.; 2. ЗПБ 16-37п; 3. КЦ 10-6; 4. ПК 24.12.4; 5. ПК 27.12.8; 6. ПТМ72.15.22-8,0 S800-2а (плиты пустотного настила), 2 шт.; 7. ПТМ75.12.22-8,0 S800 3а	136,32	13,63	6,82
8	Имущество согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1pcqR_6xO9IUEAzuaZs2ftBj5O3OOJ2h1/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	61,92	6,19	3,10
9	1. Домкрат 111-3913010 (25 тонн); 2. Домкрат 12-3913010	135,72	13,57	6,79
10	1. Каска защ. СОМ3-55, 3 шт.; 2. Каска защитная Б. б/у; 3. Каска-бейсболка Каскетка цв. син., 2 шт.; 4. Халат жен. «Гренада»; 5. Кепи-бейсболка	3,72	0,37	0,19
11	1. Форма куба ЗФК-100 (госповерка); 2. Форма куба ЗФК-100 (госповерка); 3. Форма куба ЗФК-100 (госповерка)	36,00	3,60	1,80
12	1. Стол компьютерный; 2. Стол письменный 2-тумб. зак., 2 шт.; 3. Стол-приставка заказная 1,0, 2 шт.; 4. Шкаф 47*40*217	20,28	2,03	1,01
13	1. Тел сот Nokia x2-02 RM-694; 2. Факс Panasonik KX-FT 982 RU-B	13,68	1,37	0,68
14	1. Стол письмен. с приставкой; 2. Стол-прист. заказ. 0,9х0,45; 3. Стол-приставка заказная 0.6	25,68	2,57	1,28
15	1. Электродвигатель АИР 100S4; 2. Электродвигатель ИВ-117-2	34,80	3,48	1,74
16	1. Чайник электрич. POLLY-Люкс; 2. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20; 3. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20; 4. Чайник электрич. ЭЧТЗ 1,8/1,9-220 мод.01 «Атлант»; 5. СВЧ-печь; 6. Рукосушитель автоматический	21,72	2,17	1,09
17	Теодолит 3 т 5КП № 36056	168,00	16,80	8,40
18	1. Углометр с нониусом (РФ) 4УМ (10') (госповер); 2. Угольник слесар. 160*100 3кл.; 3. Угольник столярный 1000 мм; 4. Рулетка 3 м (госповерка)	50,16	5,02	2,51
19	Лист проф. гладк. П-1250*L/0,5-ЛКПЦ-Пэ-С-RAL9003, 1.25 м²	0,90	0,09	0,05
20	1. Захват для бордюр, 3 шт.; 2. Захват крановый «Гамма», 2 шт.	59,04	5,90	2,95
21	Жидкотопливный воздухонагреватель МАК 25	92,40	9,24	4,62
22	Измеритель адгезии АР (решетка)	50,40	5,04	2,52
23	1. Кресло «Престиж», 5 шт.; 2. Полка навесная	32,64	3,26	1,63
24	Имущество согласно списку № 6: https://docs.google.com/document/d/1NJLLpjwfAkJpMzz_yEL2Kkdh-a_g-Cdd/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	126,28	12,63	6,31
25	Станок лесопильный, инв. № 37881	15,84	1,58	0,79
26	1. Сканер Epson Perfection V33 Финляндия; 2. Сот. тел. Nokia 359033044101168; 3. Стул PR ST Pt; 4. Излучатель эл. инфракр., 2 шт.	133,20	13,32	6,66

В отношении лотов №№ 1–5 проводятся одиннадцатые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 99 %.**
В отношении лотов №№ 2–24 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 90 %.**
В отношении лота № 25 проводятся десятые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 97 %.**
В отношении лота № 26 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 50 %.**
Ранее публикация о проведении аукциона размещалась в газете «Звязда» № 32 (30166) от 15.02.2024, стр. 15

Дата и время проведения открытого аукциона	**5 апреля 2024 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)**
Срок приема заявлений и оплаты задатка	**С 10.00 25.03.2024 до 16.00 03.04.2024 года**
Местонахождение имущества	В отношении лотов №№ 1–24, 26: г. Гродно, ул. Дубко, д. 11 В отношении лота № 25: г. Гомель, ул. Пригородная, 31

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ», проводимых 05.04.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по тел.: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
Вознаграждение аукциониста – 7 % (семь процентов) от конечной цены предмета торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону: по лотам №№ 1–24, 26 – +375295894134, Ольга Михайловна; по лоту № 25 – +375293045990, Дарья.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Продавец	**Открытое акционерное общество «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», +375 29 304 59 90, 8017 255 29 28)**
Организатор торгов	**ООО «Фрондера»: • 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению **открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль»** (продавец) в процедуре ликвидации юридического лица, проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ЗДАНИЯ СКЛАДА

с инв. № 640/С-38242 общей площадью 2467,1 кв. м и площадки асфальтобетонной (инв. № 98364) с инв. № 640/С-84443 общей площадью 1 612,5 кв. м, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 624650100001009966 *(право аренды по 10.12.2040)* **площадью 0,7325 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101/18.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 289 440,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **28 944,00**бел. руб.
Стоимость снижена на 50 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 02.11.2023, «Рэспубліка» от 16.12.2023, «Звязда» от 23.01.2024, 23.02.2024.

Аукцион состоится **04.04.2024** в **12.30** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.04.2024** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра: (8029) 687-59-23, (8044) 717-02-56, (8044) 738-07-38.

УНН 600074992

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 25 апреля 2024 г. проводит 3-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
9	Вертолет Ми-8МТ, № 94334, 1986 г., 4 *кат., 3176 часов, 2 КВР-2008 г.*	г. п. Мачулищи, в/ч 06752	550 000,00	110 000,00
10	Грузовой бортовой тентовый URAL 4320, кузов (рама) № б/н, рег. № АА 4268-6, г. вып. н/о, *пробег 42217 км*	г. Могилев, ул. Лазаренко, 72, Могилевское обл. УМЧС РБ	14 000,00	2 800,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 25 апреля 2024 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 22 апреля 2024 г.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 25 апреля 2024 г. с 9.15 до 10.00.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: **8 (017) 319-35-41, +375 (44) 585-76-82.**

Электронная почта: **auk@bsk.by**.

Извещение опубликовано на сайте **http://www.gki.gov.by/ru** и **https://bsk.by.**

Могилевский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества

ОАО «Ольса»

Аукцион состоится **10.04.2024 в 11.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

Лот № 1 –

легковой автомобиль SKODA SUPERB,

тип кузова – седан, кузов (рама) № TMBAB43T299035563, г. в. – 2009, р/з 3871 ВМ-6.

Начальная цена продажи: 8 596,80 бел. руб. с учетом НДС.
Сумма задатка: 859,68 бел. руб.

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 09.04.2024 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

Доп. информацию можно получить **по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего

ОАО «Поставский льнозавод»

Аукцион состоится **08.04.2024 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:

линия длинного льноволокна «Vanhauwaert»

(перечень имущества, входящий в состав Лота № 1, содержится на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).
Место нахождения Лота № 1:
Витебская обл., г. Поставы, ул. Заводская, 1.
Обременение: залог.
Начальная цена с НДС 20 % – 829 935,14 руб. Задаток - 82 993,51 руб.
Шаг аукциона – 3 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 04.04.2024 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182